ФИЛОЛОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

# Сакрэты поспеху ад выпускнікоў і студэнтаў Беларускай філалогіі



**Сувораў Аляксандр Мікалаевіч**, начальнік аддзела ідэалагічнай работы Гродзенскага абласнога ўпраўлення Міністэрства надзвычайных сітуацый Беларусі, падпалкоўнік

# *Пытанні з анкеты  Суворава Аляксандра Мікалаевіча*

***1. Ці дапамагаюць набытыя ва ўніверсітэце веды ў сённяшняй прафесійнай дзейнасці?***

Пасля службы ў органах надзвычайных сітуацый мяне запрасілі ў цэнтр прапаганды, дзе філалагічная падрыхтоўка дапамагла раскрыцца ў іншым кірунку: напісанні газетных артыкулаў, у тым ліку і на беларускай мове, падрыхтоўцы тэлевізійных і радыёэфіраў, арганізацыі рэйдаў, выступленняў, сустрэч з калектывамі, аглядаў-конкурсаў. Творчасць праходзіць праз усё маё жыццё. Са студэнцкіх часоў я ўдзельнічаў у складзе народнага ансамбля беларускай песні «Гараднiца» і прадстаўляў Беларусь на міжнародных фестывалях у розных краінах.

2.  ***Якія яркія ўспаміны і ўражанні засталіся ад вучобы ва ўніверсітэце?***

Цудоўныя выкладчыкі, выдатныя студэнты і цікавае насычанае на падзеі студэнцкае жыццё.



**Гузава Святлана Уладзіміраўна, метадыст цэнтра дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі УА “ГрІРА”.**

## *Пытанні з анкеты Гузавай Святланы Уладзіміраўны*

1. **Чаму вы выбралі для вучобы наш універсітэт?**

Па-першае, на філалагічным факультэце Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, тады яшчэ інстытуце, вышэйшую адукацыю атрымала мая маці; па-другое, яшчэ ў 11 класе, наведваючы падрыхтоўчыя курсы па беларускай мове і літаратуры, пазнаёмілася з выкладчыкамі, упэўнілася, што менавіта тут хацела б працягнуць вучобу.

2. **Чым спадабалася спецыяльнасць?**

Спецыяльнасць “Беларуская мова, літаратура, айчынная і сусветная культура”, якую я атрымала, прывабіла перш за ўсё тым, што з’явілася магчымасць вывучаць не толькі мову і літаратуру, але і культуру. Дарэчы, на першае месца працы мяне прынялі менавіта настаўнікам сусветнай мастацкай культуры.

**Павел Міхайлавіч Ушкевіч, выкладчык-філолаг, магістр філалагічных навук, дырэктар УА “СШ №6 г.Гродна”**



## *Пытанні з анкеты Паўла Міхайлавіча Ушкевіча*

**1. Чым спадабалася спецыяльнасць?**

Спецыяльнасць “Беларуская філалогія” – гэта не проста перадача новых ведаў па ланцужку “выкладчык-студэнт”. Гэта неверагодна шчырыя і адкрытыя адносіны паміж намі, студэнтамі, і выкладчыкамі. Атмасфера нязмушанасці, свабоды думак, дзеянняў, але разам з тым і досыць строгая патрабавальнасць, грунтоўнасць ведаў, высокі ўзровень падрыхтаванасці выкладчыцкага складу, прыклад прафесіяналізму, сувязь тэорыі і практыкі.

**2. Ці спатрэбіліся вам у прафесійнай дзейнасці набытыя веды і навыкі?**

Працую па спецыяльнасці з 2008 года. Безумоўна, атрыманыя веды ва ўніверсітэце – гэта моцны падмурак вялікага збудавання пад назваю прафесійная дзейнасць. Увесь час стараешся ўдасканальвацца, займацца самаразвіццём, але абавязкова з апораю на набытыя веды і навыкі падчас вучобы. Да гэтага моманту падтрымліваю цесныя кантакты з кафедрай беларускай філалогіі, выкладчыкамі, якія ніколі не адмаўляюцца дапамагчы, заўсёды ідуць насустрач. Так, як і павінна быць у сапраўднай універсітэцкай сям’і.

***Бялятка Кірыл Уладзіміравіч – выпускнік 2017г., магістр філалагічных навук, настаўнік-філолаг УА “СШ №40”***



# *Пытанні з анкеты Бялятка Кірыла Уладзіміравіча*

***1. Што вызначыла выбар спецыяльнасці?***

Рамантызм маладых гадоў і моцная хваля сучаснай беларускай культуры.

***2. Ці дапамагаюць набытыя веды ў сённяшняй прафесійнай дзейнасці?***

Цалкам. Пасля выпуску ў 2017 годзе я самастойна пайшоў працаваць у школу. Безумоўна, некаторыя нюансы прафесійнай часткі пазнаюцца толькі падчас уласнай выкладчыцкай дзейнасці. Але асноўны масіў ведаў фарміруецца ў гады студэнцтва. Падчас вучобы на філфаку адбываецца не проста засваенне тэарэтычных ведаў. Вялікая ўвага аддаецца і практычнай частцы. Напрацягу вучобы студэнты набываюць уменні падчас рознага віду практык (фальклорная, дыялекталагічная), спрабуюць свае сілы ў працы рэдакцый часопісаў і газет, праходзяць даволі працяглую практыку ў якасці настаўнікаў школ.

Да слова, я працую ў СШ №40 настаўнікам беларускай мовы і літаратуры (2 катэгорыя). Закончыў паспяхова магістратуру, зараз навучаюся ў аспірантуры.



**Радковіч Аляксандра Іванаўна,**

**Студэнт года- 2017, выпускніца 2020г., магістрант кафедры беларускай філалогіі, настаўнік-філолаг УА «СШ №35»**

# *Пытанні з анкеты Радковіч Аляксандры Іванаўны*

**Чым табе падабаецца спецыяльнасць?**

*Я навучалася на спецыяльнасці “Беларуская філалогія”, а гэта значыць, што мой шлях звязаны з такім багатым і прыгожым родным словам. Дзякуючы сапраўдным Выкладчыкам (з вялікай літары), мы кожны дзень пераносімся ў свет мінулага і будучага, міфаў і легенд, пражываем жыццё таленавітых пісьменнікаў, вывучаем родную мову з яе вытокаў. І я рада, што ў мяне ёсць такая магчымасць,папулярызаваць і несці роднае слова ў свет.*

**Якія запамінальныя ўражанні засталіся ад вучобы?**

*Калі я паступала ў ГрДУ ім.Янкі Купалы, я і ўявіць сабе не магла, як гэта зменіць маё жыццё. З першага курса я актыўна ўлілася ў творчае і навуковае жыццё ўніверсітэта. Мне пашчасціла прыняць удзел у шматклікіх конкурсах і мерапрыемствах, сустрэчах і імпрэзах. Самымі яркімі з іх сталі “Альма-матэр”, “Студэнт года”, “Цыцэроній” – усё гэта зрабіла маё студэнцкае жыццё яркім і насычаным, стала незабыўным момантам.*

**Богдан Павел, студэнт спецыяльнасці «Беларуская філалогія»**

**4 курс**



# *Пытанні з анкеты Богдана Паўла*

**1. Чаму вы выбралі для вучобы наш універсітэт?**

ГрДУ я выбраў таму, што ведаў: гэта адзін з найлепшых універсітэтаў нашай рэспубліцы. Я быў упэўнены, што менавіта тут я атрымаю годную адукацыю, бо тут працуюць сапраўдныя прафесіяналы, цікавыя і творчыя людзі. Гродзенскі універсітэт – гэта месца, дзе я магу рэалізаваць сябе.

2. **Чым спадабалася спецыяльнасць?**

Мне вельмі падабаецца спецыяльнасць, якую я выбраў, бо настаўнік – гэта першы і галоўны праваднік у жыццё, узор для маладых людзей. Гэта вельмі адказная прафесія. На жаль, настаўнікаў-мужчын вельмі мала. І я хачу быць адным з іх.




**Сецько Маргарыта, студэнтка спецыяльнасці “Беларуская філалогія” 3 курс, мае тытул «Гарадзенская беларусачка - 2019».**

# *Пытанні з анкеты Сецько Маргарыты*

1. **Чым табе падабаецца спецыяльнасць?**

   Мне заўсёды падабалася вучыць мовы. У школе я часта ўдзельнічала ў розных алімпіядах. Мне шанцавала на добрых настаўнікаў-філолагаў. Я люблю чытаць беларускую літаратуру, слухаць беларускія песні, размаўляць па-беларуску. Таму не шкадую аб сваім выбары спецыяльнасці.

2. **Якія запамінальныя ўражанні засталіся ад вучобы?**

Мне вельмі прыемна, што нас вучаць выкладчыкі-прафесіяналы. Вывучанае з іх дапамогай не забываецца. Спадзяюся, гэта ўсё спатрэбіцца нам і далей. Універсітэт і факультэт даюць шмат магчымасцей раскрыцца і ў творчым рэчышчы. Асаблівае месца ў маіх успамінах займае конкурс «Гарадзенская беларусачка-2019», у якім я прымала ўдзел і атрымала такую важную для мяне перамогу. Усё, чым я займаюся ва універсітэце, прыносіць мне вялікае задавальненне.



**САЎКО КАЦЯРЫНА:**
**студэнтка 2 курса спец. “Беларуская філалогія”**

# *Пытанні з анкеты Саўко Кацярыны*

***1. Што абумовіла выбар спецыяльнасці "Беларуская філалогія" і паступленне менавіта ў ГрДУ імя Я.Купалы?***

Яшчэ ў 7 класе, я вырашыла, што буду вучыцца на спецыяльнасці: "Беларуская філалогія". Я з'яўлялася пастаянным удзельнікам і пераможцам прадметных алімпіяд, навуковых канферэнцый, абласных конкурсаў, прысвечаных роднай мове і прафесіі педагога. Выбрала іменна ўніверсітэт імя Янкі Купалы, таму што была тут на экскурсіях, конкурсах, таму што ўніверсітэт з 'яўляецца аўтарытэтнай навучальнай установай, тут вучацца мае сябры, і проста таму, што люблю Гродна.

***3. Чаго вы чакаеце ад свайго выбару? Якія бачыце перспектывы?***

У далейшым планую закончыць магістратуру, працаваць па спецыяльнасці. Хачу пашырыць адносіны са студэнтамі іншых краін, найбольш Польшчы, і выкладаць сваю родную мову для замежных студэнтаў.

**МАЛГАЖАТА ЛУДЗІЧ, студэнтка 2 курса спец. “Беларуская філалогія” 191 група**



# *Пытанні з анкеты Лудзіч Малгажаты*

***1. Што абумовіла выбар спецыяльнасці "Беларуская філалогія" і паступленне менавіта ў ГрДУ імя Я.Купалы?***

На працягу многіх гадоў я назірала за працай сваёй матулі, якая працуе настаўніцай пачатковых класаў, таксама за цёцяй, якая з'яўляецца выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры. Яны абедзве выпускніцы ГрДУ імя Янкі Купалы, і многа добрага і цікавага расказвалі пра студэнцкае жыццё і сам універсітэт. А яшчэ мой дзядзька-святар заўсёды размаўляе на беларускай мове, і мне гэта вельмі падабаецца. Таму я і выбрала такую спецыяльнасць, як беларуская філалогія, і паступіла ў ГрДУ імя Янкі Купалы.

***2. Чаго вы чакаеце ад свайго выбару? Якія бачыце перспектывы?***

У будучым хачу звязаць свой жыццёвы шлях з рэдакцыйнай дзейнасцю.

***Калі ты творчы,***

***малады і***

***энергічны,***

***Цябе чакае***

***факультэт філалагічны!***